Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Пераадолець перашкоды, якія ўзнікаюць, дазволяць душэўны спакой, упэўненасць у правільна выбраным напрамку і ва ўласных сілах. У аўторак не варта давяраць усім без разбору. Многія абяцанні не будуць выкананыя. Пятніца — дзень зносін. Вас чакаюць сустрэчы з людзьмі з даўняга мінулага і новыя знаёмствы. У суботу пастарайцеся правесці вечар з каханым чалавекам, інакш у вас ці ў яго могуць з'явіцца падставы для рэўнасці.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень спрыяльны для новых спраў, пошуку дзелавых партнёраў і аднадумцаў. Адзінае, што можа азмрочваць настрой, гэта спазненні і спешка, таму паспрабуйце разлічваць час, звязаны з паездкамі і перасоўваннямі, «з запасам». Дарэчы, закаханасць не заўсёды спрыяе засяроджанасці ў працы. Так што лепш не ўзвальваць на сябе дадатковыя заданні.

БЛІЗНЯТЫ. На працы магчымыя змены да лепшага. У вас можа з'явіцца рэальны шанц падняцца па кар'ернай лесвіцы і атрымаць прыбаўку да зарплаты. На гэтым тыдні вас можа чакаць запрашэнне ў дзелавую паездку за мяжу. Пятніца пацешыць прыемнай інфармацыяй, якая дазволіць змяніць у лепшы бок фінансавае становішча. У выхадныя з'явіцца магчымасць завяршыць назапашаныя хатнія справы.

РАК. Тыдзень можа аказацца цікавым і насычаным падзеямі, важна правільна размеркаваць сілы і энергію. Асноўную частку часу паглыне праца. У панядзелак пажадана паставіць перад сабой дакладную мэту і прытрымлівацца яе. Сярэдзіна тыдня — выдатны момант для сур'ёзных перамен у асабістым жыцці. Будзьце адкрытыя са сваім выбраннікам.

ЛЕЎ. На гэтым тыдні асаблівую важнасць набудуць кантакты, сувязі і паездкі. Вы вельмі таварыскія і здольныя пра ўсё дамовіцца. Да чацвярга прывядзіце ў парадак усе дакументы, гэта ў вас атрымаецца лёгка і эфектыўна. Можна таксама разлічваць на разумную падтрымку і дапамогу калег. Выяўляйце настойлівасць пры адстойванні сваіх інтарэсаў, і поспех у справах забяспечаны. Пятніца — добры момант для пачатку доўгачаканага адпачынку.

ДЗЕВА. Амаль ідэальны тыдзень для таго, каб заняцца падрыхтоўкай і рэалізацыяй сур'ёзных дзелавых планаў. Асабліва цікавыя ідэі вас могуць наведаць у сераду, паспрабуйце запісаць іх, каб не выпусціць з-пад увагі вельмі неабходныя, хоць на першы погляд і нязначныя, дэталі. Будзеце здольныя разбурыць парачку гор, асабліва ў хатніх справах. Прычым ад вас не спатрэбіцца сур'ёзных намаганняў. У выхадныя, асабліва ў нядзелю, адчуеце супакаенне. Правядзіце час за горадам з сям'ёй.

ШАЛІ. Нарэшце шматлікія праблемы, якія не давалі спакойна жыць, знікнуць. Зоркі кажуць, што ў вас з'явіцца мудры дарадца. Панядзелак добры для спраў, якія можна хутка скончыць. У аўторак таксама непажадана пачынаць нешта новае, але калі сітуацыя распарадзіцца па-свойму, не спытаўшы дазволу зорак, то асаблівую ўвагу ўдзяляйце фінансаваму боку справы і правільнаму афармленню дакументаў. Пятніцу варта правесці ў рамантычнай абстаноўцы, стварыўшы для гэтага ўсе ўмовы загадзя.

СКАРПІЁН. Сітуацыя на працы складваецца на вашу карысць. Калегі гатовыя праявіць сяброўскія пачуцці і зрабіць прыемны падарунак. У сераду новыя пазітыўныя абставіны ўвойдуць у жыццё, што дазволіць вам быць аптымістам. Многія справы вырашацца без асаблівых намаганняў, скарыстайцеся гэтым, каб справіцца з найбольш надзённымі праблемамі. У нядзелю эмоцыі будуць біць цераз край, на шчасце — станоўчыя.

СТРАЛЕЦ. Калі не будзеце занадта задзіраць нос і выхваляцца дасягненнямі, вам гарантаваны поспех. Надыходзіць час творчасці і высокай актыўнасці, асабліва ў інтэлектуальнай дзейнасці. Але сцеражыцеся перашчыраваць з працай. Паспрабуйце, каб рабочыя пытанні не перашкаджалі асабістаму жыццю. У пятніцу не варта пераконваць начальніка, упэўненага ў сваёй праваце. Гэта той выпадак, калі прамаўчаць будзе лепш з усіх пунктаў гледжання.

КАЗЯРОГ. Пасля адпачынку ваш настрой (ды і стан) можа аказацца абсалютна непрацоўным. Паспрабуйце сабрацца, паколькі менавіта цяпер вы зможаце вырашыць нават самыя, здавалася б, спрэчныя пытанні ў прафесійнай сферы. Калі, вядома, не будзеце марнаваць час і сілы на крытыку навакольных і жаль да сябе. У выхадныя зносіны з дзецьмі і блізкімі сваякамі запатрабуюць шмат часу, будзьце да гэтага гатовыя.

ВАДАЛІЎ. Тыдзень можа аказацца актыўным і плённым пры ўмове, што не будзеце занадта самаўпэўненымі і транжырлівымі. Вам проста неабходна зразумець абстаноўку ў калектыве і не цягнуць коўдру на сябе. Серада добрая для дзелавых перагавораў. У нядзелю паспрабуйце не марнаваць шмат часу на пустую балбатню.

РЫБЫ. У панядзелак вам могуць прапанаваць на першы погляд перспектыўную справу, у якую неабходна ўкласці пэўныя рэсурсы, але не спяшайцеся прыняць гэтую прапанову, варта ўсё прадумаць. Пачынаючы з аўторка сітуацыя зменіцца і дазволіць здзейсніць рывок у кар'еры. У чацвер не варта спрабаваць вырашаць некалькі пытанняў адначасова, лепш не спяшацца і зрабіць усё якасна, адклаўшы нешта на потым. У выхадныя паспрабуйце выбрацца на прыроду.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.04	21.27	16.23
Віцебск —	4.46	21.24	16.38
Магілёў —	4.54	21.17	16.23
Гомель —	4.58	21.06	16.08
Гродна —	5.21	21.41	16.20
Брэст —	5.29	21.34	16.05

Месяц

Першая квадра 19 ліпеня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Еўдакіі, Ефрасінні, Марыі, Германа, Лук'яна, Фамы.*
К. *Чаславы, Гераніма, Ілы, Часлава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

20 ЛІПЕНЯ

У краіне

1880 год — нарадзіўся (г. Слонім) Гальяш Леўчык (Ілья Ляўковіч), беларускі паэт. Служыў у канцылярыях з'езду міравых суддзяў, судовага следчага, пісарам у каморніка. У 1908—1912 гадах супрацоўнічаў з газетай «Наша ніва». Выдаў зборнік вершаў «Чыжык беларускі». Аўтар вострапубліцыстычных вершаў «Дружна, браты!», «Даволі!», «Хто адрокся сваіх», філасофскіх паэм у прозе «Хараство» і «Чалавек». У Варшаве і Слоніме меў багатую бібліятэку. Калекцыяніраваў выданні пра Беларусь, кераміку. Маляваў, іграў на розных інструментах, спяваў, збіраў фальклор. Сабраў унікальныя дакументы аб Слоніме і Слонімшчыне. Асуджаў рэжым польскіх уладаў у Заходняй Беларусі. Выступаў за свабоду роднага слова. У публіцыстыцы выступаў за правы беларусаў на сваю культуру. Перакладаў на беларускую мову творы А. Міцкевіча, М. Някрасава і іншых аўтараў. Памёр у 1944 годзе.

1980 год — у Мінску прайшоў (20—27 ліпеня) групавы адборачны футбольны турнір XXII Алімпійскіх гульняў, у якім прынялі ўдзел каманды Алжыра, Ірака, Іспаніі, Коста-Рыкі, Сірыі, Фінляндыі і Югаславіі.

1942 год — нарадзіўся (вёска Палянічыцы Баранавіцкага раёна) Сяргей Мікалаевіч Чаранкевіч, беларускі фізік і біяфізік, акадэмік НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар. Аўтар больш як 550 навуковых прац у галіне біяфізікі клеткі, клетачнай інжынерыі, клетачнай інфарматыкі, нейраінфарматыкі. Распрацаваў шэраг метадаў дыягностыкі захворванняў і тэсціравання фармакалагічных прэпаратаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

Міжнародны дзень шахмат. Адзначаецца ў дзень заснавання ў Парыжы (1924 год) Міжнароднай шахматнай федэрацыі (ФІДЭ).

1304 год — нарадзіўся Франчэска Петрарка, вялікі італьянскі паэт, родапачынальнік гуманістычнай культуры Адраджэння, адзін са стваральнікаў літаратурнай італьянскай мовы. Памёр у 1374 годзе.

1930 год — нарадзіўся Алег Анофрыеў, расійскі і савецкі артыст тэатра і кіно, аўтар і выканаўца песень, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Сакрэт прыгажосці», «Горы клічуць», «Чалавек з бульвара Капуцынаў», «Інкогніта з Пецярбурга». Памёр у 2018 годзе.

1969 год — спускаемы апарат амерыканскага пілатуемага карабля «Апалон-11» здзейсніў першую ў гісторыі пасадку на Месяц. 21 ліпеня астранаўты Ніл Армстранг і Эдвін Олдрын выйшлі на паверхню Месяца.

УСМІХНЕМСЯ

Раскажыце пра метады пахудзення. Праўда, мяне не цікавіць «менш ежы, больш спорту».

Мяне цікавіць «стрыжэш пасмы на маладзіку, чытаеш замову, кладзеш пад падушку і худзееш на пяць кілаграмаў», нешта такое.

— Доктар, я толькі што даведаўся: мяне будзе аперыраваць практыкант Сідараў.

— Так, аперацыя заўтра.

— Дык жа зарэжа!

— А мы яму двоечку паставім.

Мая дзяўчына ўпэўненая, што за рахунак у рэстаране мы павінны плаціць пароўну, нават калі яна была з мамай.

А я — дома...

— Вы рыбак?

— Толькі па святах і пад добрую закуску.

carcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2654.

Нумар падпісаны ў 19.30 19 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12